# Сучаснае інфармацыйна-камунікатыўнае асяроддзе і яго асаблівасці

Дубянецкая Марыя Сяргееўна
УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

У сучасным постіндустрыяльным грамадстве роля інфармацыйных рэсурсаў увесь час узрастае. Інфарматызацыя ўсё глыбей пранікае ў асновы нашага жыцця, аказваючы ўплыў на працэсы мадэрнізацыі і глабалізацыі ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці – навукі, культуры, навучанні.

Міжасобасная камунікацыя ўсё часцей замяняецца віртуальнай на ўсіх узроўнях зносінаў. Пад віртуальнасцю зносінаў разумеецца яе апасродкаванасць сеткай Інтэрнэту, што дазваляе перадаваць і адначасова захоўваць інфармацыю ў выглядзе прадуктаў дзейнасці. На гэтую асаблівасць часта ўказваюць даследчыкі, гаворачы пра адраджэнне эпісталярнага жанру з развіццём электроннай перапіскі.

Да сённяшняга часу большасць сродкаў камунікацыі ў Інтэрнэце – тэкставыя, хаця роля фота- і відэаматэрыялаў хутка ўзрастае. Тым не менш, ананімнасць і абмежаванасць інфармацыі накладваюць свой адбітак на характар зносінаў у віртуальным асяроддзі. Можна вылучыць асобныя рысы, уласцівыя віртуальнай камунікацыі ў цэлым: “гібрыдная” форма камунікацыі, прыярытэтнасць хуткага выражэння думкі, магчымасць ананімнасці. Камп’ютар поўнасцю змяніў не толькі характар абыходжання з інфармацыяй, але і нашы ўяўленні пра працэс камунікацыі. У сувязі з гэтым правамерна вылучэнне зносінаў, якія ажыццяўляюцца пры дапамозе камп’ютара як асобы тып камунікацыі. Моўным карэлятам данага тыпу зносінаў выступае камп’ютарны, ці электронны, дыскурс як адна з формаў віртуальнага дыскурсу. Як указваюць сучасныя даследчыкі, напрыклад, Т.Ю. Базараў, у віртуальным асяроддзі фарміруецца новы від камунікацыі, які адрозніваецца ад міжасобаснай і масавай камунікацыі [1, с. 47]. Віртуальная камунікацыя ёсць разнавіднасць электронных зносінаў пры дапамозе камп’ютара, які знаходзіцца ў рэжыме ан-лайн. Такім чынам, да сферы віртуальнай камунікацыі адносяць тыя разнавіднасці тэксту, для якіх прыярытэтна падпарадкаванне гэтай мэце: зносіны ў ICQ, чаты, блогі, форумы, сацыяльныя сеткі.

Інтэнсіўнае развіццё Інтэрнэта як камунікатыўнага асяроддзя прывяло да з’яўлення шматлікіх навуковых прац па дадзенай праблематыцы. На думку А.І. Гарошка, на даны момант можна гаварыць пра фарміраванне асобнай дысцыплінарнай парадыгмы “Лінгвістыка тэксту” [2, с. 29]. Асноўнай мэтай гэтага напрамку з’яўляецца апісанне і тлумачэнне асаблівасцей функцыянавання мовы ў Інтэрнэце. Сярод вучоных-лінгвістаў няма адзінай думкі адносна намінацыі і выдзялення характэрных рысаў інтэрнэт-камунікацыі. А.Я. Жычкіна лічыць, што віртуальная камунікацыя – гэта сінтэз пісьмовага і вуснага маўлення. Яно характарызуецца магчымасцю міжасобасных зносінаў адначасова

з вялікай колькасцю партнёраў, пры гэтым трэба адзначыць павелічэнне хуткасці атрымання і апрацоўкі інфармацыі. Гэта прыводзіць да выбіральнасці суб’екта, змянення спосабу апрацоўкі інфармацыі. Адбываецца апрошчанне, рэдуцыраванне моўных сродкаў, што можа вызваць праблему адэкватнага разумення.

З пункту гледжання лінгвістыкі, зносіны могуць быць вербальнымі, невербальнымі і паравербальнымі (калі моўнай плыні нябачнага субяседніка адпавядаюць паўзы, галасавыя інтанацыі і г.д.). Зносіны ў чатах прыбліжаюцца да паравербальных за кошт выкарыстання слоўнікаў і іншых падобных сродкаў.

Інтэрнэт-камунікацыя – гэта асобае віртуальнае камунікатыўнае асяроддзе, асобае месца рэалізацыі мовы. Пры віртуальнай камунікацыі субяседнікі толькі ўяўляюць сабе вобразы адзін аднаго.

Формы зносінаў у Інтэрнэце шматлікія. Найбольш папулярная класіфікацыя па ступені інтэрактыўнасці. Вылучаюць дзве асноўныя формы камунікацыі: сінхронная і асінхронная. Да першай, найбольш інтэрактыўнай формы, адносяць чаты, ролевыя гульні, да другой – веб-форумы, дыскусійныя спіскі, электронную пошту, спіскі рассылкі, тэлеканферэнцыі.

Другое распаўсюджанае дзяленне ў Інтэрнэце адбываецца па крытэрыі накіраванасці зносінаў: або на самі зносіны (зносіны дзеля зносінаў), што часта адрознівае чаты, або на пэўны прадмет, тэму, як у тэматычных форумах і канферэнцыях.

Такім чынам, спецыфічнымі характарыстыкамі віртуальнай камунікацыі з’яўляюцца аб’яднанне вялікай колькасці разнастайных тыпаў дыскурсу і маўленчых практык; своеасаблівасць стварэння і ўспрымання тэксту; дыстантнасць і ананімнасць удзельнікаў зносінаў, што стымулююць парушэнне моўнай нормы, неадрэдагаванасць тэксту.

Літаратура

1. Базаров, Ю. Т. Психологические грани изменяющейся организации / Ю. Т. Базаров. – М. : Аспект Пресс, 2007. – 209 с.

2. Горошко, Е. И. К уточнению понятия “компьютерно-опосредованная коммуникация”: проблемы терминоведения [Электронный ресурс] / Е. И. Горошко. – Режим доступа: http: www.ibels.ieee.org.